

# *Шамякін Іван Пятровіч*

Народны пісьменнік БССР

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

Герой Сацыялістычнай Працы

**30 студзеня 1921 года**, дзень нараджэння - сяло Карма Кармянскай воласці Гомельскага павета Гомельскай губерні РСФСР.





**1936** - І. Шамякін закончыў Макаўскую сямігадовую школу Пракопаўскага сельсавета Церахоўскага раёна. У тым жа годзе паступіў на вучобу ў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў. Удзельнічаў у літаратурным аб'яднанні пры абласной газеце "Гомельская праўда".

- **1940** - заканчвае тэхнікум і па размеркаванню працуе ў далучанай да БССР Заходняй Беларусі - у райпрамкамбінаце ў г. Беластоку (цяпер Польшча).






# Вялікая Айчынная вайна





**1941 - 1945** - удзел у Вялікай Айчыннай вайне, у баях пад Мурманскам, Кандалакшай, Петразаводскам, у вызваленні Польшчы, у штурме Берліна.






- **1945**, кастрычнік - дэмабілізацыя; працуе настаўнікам Пракопаўскай школы Цераховўскага раёна. У двух апошніх нумарах за той год часопіс "Полымя" надрукаваў яго першы буйны твор - аповесць "Помста".



- **1946** - пaступае на завочнае аддзяленне Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. Чкалава.

- **1947** - уступленне ў члены Саюза пісьменнікаў БССР

- **1948** - накіраваны на вучобу ў Рэспубліканскую Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. Пераезд на пастаяннае жыхарства ў Мінск.

- **1949** - Асобнымі выданнямі выйшлі з друку раман "Глыбокая плынь" (папярэдне друкаваўся ў часопісе "Полымя") і зборнік апавяданняў "На знаёмых шляхах". Узнагароджанне ордэнам "Знак Пашаны".









- **1950** - заканчэнне вышэйшай партыйнай школы. Назначэнне галоўным рэдактарам альманаха "Советская Отчизна", які выдаваўся ў Мінску на рускай мове.



- **1951** - за раман "Глыбокая плынь" малады пісьменнік удастоены Сталінскай прэміі (Дзяржаўнай прэміі СССР).






- **1954** - І. П. Шамякін выбраны намеснікам старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР і членам праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.



- **1955** - узнагароджанны двума ордэнами Працоўнага Чырвонага Сцяга.






- **1957** - выдадзены раман "Крыніцы"

- **1963** - выйшаў з друку раман "Сэрца на далоні".








- **1964** - Асобным выданнем надрукаваны цыкл аповесцяў - пенталогія "Трывожнае шчасце".
- **1968** - выдадзены раман "Снежныя зімы"



- **1971** - святкаванне 50-годдзя з дня нараджэння. Узнагароджанне трэцім ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выбранне Старшынёй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР - г. зн. кіраўніком парламента краіны.



- **1974** - выйшаў з друку раман "Атланды і карыятыды".



- **1976** - выбранне кандыдатам у члены ЦК КПБ. Узнагароджанне ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.



- **1979** - выдадзены раман "Вазьму твой боль" і Збор твораў у шасці тамах.






- **1980** - выбранне членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР. Назначэнне галоўным рэдактарам выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя".



- **1981** – член ЦК КПБ, дэлегат XXVI з'езда КПСС. За вялікія заслугі ў развіцці савецкай літаратуры, плённую грамадскую дзейнасць і ў сувязі з 6О-годдзем І. П. Шамякіну прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля "Серп і Молат".


ЛЕНИН



- **1991** - надрукаваны раман "Злая зорка" аб наступствах Чарнобыльскай катастрофы.



- **1993 - 2004** - публікацыя буйных твораў "Падзенне","Сатанінскі тур", "Палеская мадона", "Вялікая княгіня", "Слаўся, Марыя!", "Пошукі прытулку", "Стары рамантык", "Начныя ўспаміны" і інш.

- 80-годдзя І. П. Шамякіна







- **26 студзеня 2001 г**. – узнагароджанне ордэнам Айчыны III ступені.



- **12 красавіка 2002 г.** – уручана прэмія Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва.



- **14 кастрычніка 2004 г. – дата смерці пісьменніка.**



- 14.11.2006 адкрыццё помніка І.П. Шамякіну ў Мінску

